6. *Довнар-Запольский М. В.* Очерки по организации западнорусского крестьянства в XVIв. – Киев., 1905.
7. *Касько У. К.* Палескі дзівасіл: Бел. нар. прыказкі, прымаўкі, выслоўі: са скарбніцы *А. К. Сержпутоўскага*/ *У. К. Касько*. – Мн.: Выш. шк., 2005. – 383с.
8. *Ліс А. С.* Жніўныя песні. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 238с.
9. *Сержпутоўскі А. К.* Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета. – Мн.: Універсітэцкае, 2000. – 270с.
10. *Сержпутовский А. К.* Очерки Белоруссии// Живая старина. СПб., 1907. Вып. 3,4.
11. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588/ Пер. на бел. мову *А. С. Шагун.* – Мн.: Беларусь, 2005. – 207с.: іл.
12. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989.

## КАНЦЫЛЯРЫЯ ГУБЕРНАТАРА ЯК ОРГАН ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 30–50 гг. XIX ст.

**Г. С. Кліз**

На губернатара была ўскладзена вялікая колькасць спраў і абавязкаў. Зразумела, што адной асобе іх нельга было адолець, таму кіраванне губерняй губернатар ажыццяўляў пры дапамозе спецыяльнай канцылярыі і чыноўнікаў для асобых даручэнняў. Апошнія займаліся найбольш важнымі для начальніка губерні справамі: расследаваннем службовых злоўжыванняў і беспарадкаў, рэвізіямі дзяржаўных устаноў, выкананнем сакрэтных распараджэнняў і г.д [4, арк. 48]. Губернская канцылярыя з'яўлялася сувязным звяном губернатара з падначаленымі ўстановамі і з вышэйшымі органамі ўлады імперыі.

Служачыя канцылярыі знаходзіліся ў вядзенні губернатара і падначальваліся непасрэдна яму. Назначэнне і звальненне гэтых чыноўнікаў залежала ад губернатара. Толькі чыноўнікі для асобых даручэнняў пры ім назначаліся і звальняліся па зацвярджэнню міністра ўнутраных спраў [7, арт. 647].

Штат канцылярыі зацвярджаўся Сенатам [5, № 17112]. Прыкладны склад канцылярыі губернатара можна разгледзець на аснове дадзеных аб канцылярыі віцебскага губернатара. Так, на падставе штата 1845 г., яго канцылярыя складалася з правіцеля канцылярыі, 3 старшых і 3 малодшых памочнікаў правіцеля канцылярыі і рэгістратара. Акрамя таго, пры губернатары знаходзіліся 2 старшыя і 2 малодшыя чыноўнікі для асобых даручэнняў, якія атрымоўвалі жалаванне па штату, 1 старшы і 1 малодшы без жалавання. З адпушчаных па штату сродкаў адна частка выкарыстоўвалася на выдачу платы 12 штатным чынам, а з астатняй сумы ўтрымліваліся 10 канцылярскіх служачых і пісараў, якія знахо-

дзіліся на службе, і 6 вольнанаёмных пазаштатных супрацоўнікаў [3, арк. 43 ад., 44].

У штат канцылярыі губернатара маглі ўваходзіць і перакладчыкі [1, с. 73], а таксама журналісты, пра якіх згадваецца ў Сводзе законаў [6, арт. 305].

Аднак колькасць служачых была не пастаяннай. Гэта адбывалася з-за таго, што склад канцылярыі залежаў ад сумы грошаў, выдаткаваных на яе ўтрыманне. Губернатар не меў права выходзіць за межы гэтай сумы. Рэшткі, якія склаліся напрыканцы года, губернатар мог скарыстаць на пакупку для канцылярыі кніг законаў ці канцылярскіх матэрыялаў, а таксама на прызначэнне часовай дапамогі для заахвочвання чыноўнікаў і служачых канцылярыі [7, арт. 646].

З-за сваёй набліжанасці да губернатара служачыя маглі засяроджваць у сваіх руках усё кіраванне губерняй. Былі выпадкі, калі губернатар поўнасцю перадаваў справы свайму правіцелю канцылярыі [1, с. 73].

Старшыя памочнікі правіцеля канцылярыі вялі ўсе справы самастойна і свядома не дапускалі сваіх падначаленых «амаль ні да якіх спраў, ні да складання дакладаў, і падрыхтоўцы праектаў выканаўчых лістоў, а займалі іх адной толькі перапіскаю» [3, арк. 18 ад.]. Такім чынам яны імкнуліся паставіць у залежнасць ад сябе губернатара.

Да пытанняў, якімі павінна была займацца канцылярыя грамадзянскага губернатара, належалі наступныя: складанне справаздач і іншых ведамасцяў; сакрэтныя справы, даручаныя асабіста губернатару, і тыя, якія патрабавалі хуткага выканання; перапіска па прызначэнню дваранскіх сходаў і па зацвярджэнню дваранскіх выбараў; перапіска па прадстаўленню да розных узнагарод, якія не маглі быць выкананы ў губернскім праўленні ці прыказе грамадскай апекі; выдача падарожных, замежных пашпартоў і іншых пасведчанняў; перапіска па агляду губерні, па выкананні рэкруцкіх набораў, па зацвярджэнню размеркавання кватэрнай павіннасці, па разгляду губернатарам крымінальных, следчых і іншых судовых спраў [7, арт. 643].

Выкананне гэтых пытанняў у канцылярыі губернатара было падзелена паміж сталамі і рэгістратурай, дзе вяліся кнігі і рэестры. Трэба адзначыць, што кнігі і рэестры вяліся вельмі дрэнна. У прыватнасці, сенатарская рэвізія канцылярыі віцебскага губернатара выявіла, што многія кнігі адсутнічалі, а тыя, якія знаходзіліся ў канцылярыі, вяліся няправільна ці змяшчалі шмат памылак, былі не перанумараваны і не прашнураваны, без належных у канцы надпісаў пра колькасць лістоў [3, арк. 44 ад.-48].

Доўгі час свайго існавання канцылярыя не мела структурных падраздзяленняў. Толькі ў пачатку 30-х гг. XIX ст. былі створаны сталы

(аддзелы), кожны з якіх разглядаў пэўнае кола пытанняў. Так, напрыклад, канцылярыя віцебскага губернатара была падзелена на 6 сталоў у 1830 г., магілёўскага ў 1831 г., а мінскага ў 1837 г [2, с. 12]. У розных губернях размеркаванне функцый паміж сталамі не было аднолькавым і залежала ад мясцовых асаблівасцей.

Так, канцылярыя віцебскага губернатара падзялялася на:

1. Паліцэйскі стол, які заведваў справамі паліцыі, перапіскай аб следствах, а таксама справамі па прашэннях прыватных асоб;

2. Казначэйскі стол. Заведваў прыходам і расходам сумаў канцылярскіх і перасылачных, выдачай падарожных, пашпартоў, перапіскай пра пенсіі і выдачай пасведчанняў;

3. Гаспадарчы стол, які заведваў справамі і перапіскай па гаспадарчай часці;

4. Статыстычны стол. Заведваў збіраннем рознага роду хуткіх дадзеных для дастаўлення іх у міністэрствы, справамі аб здарэннях, а таксама складаннем гадавых справаздач пра становішча губерні;

5. Стол агульных спраў. Заведваў агульнымі справамі кіравання, рэкруцкімі справамі і сакрэтнай перапіскай;

6. Судны стол. У ім займаліся вядзеннем крымінальных і следчых спраў, перапіскай пра арыштантаў і раскольнікаў.

Рэвізія гэтай канцылярыі ў 1853 г. выявіла, што справы знаходзіліся ў вялікім беспарадку. Ва ўсіх сталах назіралася маруднасць і адсутнасць кантролю за выкананнем распараджэнняў. Толькі сакрэтныя справы ў большасці сваёй вяліся дакладна і аккуратна [3, арк. 53, 64, 74 ад., 103, 111 ад., 113 ад.].

Так, напрыклад, справы паліцэйскага стала па прашэннях прыватных асоб выконваліся вельмі марудна. Маруднасць гэта была вынікам абсалютнай адсутнасці кантролю за выкананнем зробленых распараджэнняў, бо ў большасці выпадкаў звесткі, якія былі запатрабаваны, не толькі не дастаўляліся, а нават на працягу пяці, шасці і болей год не рабілася ніякага адказу [3, арк. 51 ад.].

Такая ж маруднасць назіралася ва ўсіх сталах, гэта прыводзіла да парушэння сувязей паміж губернатарам і рознымі ўстановамі, як падначаленымі, так і вышэйстаячымі. Напрыклад, распараджэнні генерал-губернатара часам пакідаліся ўвогуле без адказу ці выконваліся праз год [3, арк. 11 ад.]. Віленскі генерал-губернатар Бібікаў канстатаваў, што атрымліваў інфармацыю пра становішча ў губерні прыватным чынам, паколькі падначаленыя яму месцы не даносілі аб розных, часам цікавых, здарэннях [1, с. 74]. Са значным спазненнем выконваліся цыркуляры

міністэрства ўнутраных спраў, загады Сената, і нават распараджэнні самаго імператара.

Загружанасць сталоў была рознай. Так, шмат спраў прыпадала на казначэйскі і пашпартны сталы канцылярыі віцебскага губернатара, у той час як у гаспадарчым стале «заняткі … былі вельмі нязначныя» [3, арк. 16].

Канцылярыя губернатара мела свой архіў, куды перадаваліся выраша-ныя справы. Аднак на прыкладзе канцылярыі віцебкага губернатара можна сцвярджаць, што архіў гэты насамрэч з'яўляўся свайго рода складам для непатрэбных папер канцылярыі, бо «архіў губернатарскай канцылярыі мае толькі адну вонкавую форму некаторага парадку, так як большая частка спраў знаходзіцца ў звязках і размяшчаецца па паліцах, аднак у сутнасці сваёй архіў знаходзіцца ў поўным беспарадку.

Передача спраў у архіў адбывалася без усялякага парадку, без вопісаў, без распісак і без дакладнага разбірання спраў» [3, арк. 120–120 ад.]. Такое становішча архіва можна патлумачыць толькі няўважлівым стаўленнем кіраўніцтва і чыноўнікаў канцылярыі да яго. Так, вядзенне архіва было перададзена аднаму чыноўніку, прытым вольнанаёмнаму, у той час як для разбору архіва і складання дакладнага алфавіту ўсіх спраў патрэбна была праца не аднаго адказнага чыноўніка.

Канцылярыя грамадзянскага губернатара прызначана была дапамагчы яму выконваць свае службовыя абавязкі. Яна сканцэнтравала ў сабе ўсё справаводства і з'яўлялася сувязным звяном паміж губернатарам і іншымі адміністрацыйнымі ўстановамі. Праз канцылярыю, як свое-асаблівы інфармацыйны цэнтр, праходзілі звесткі аб усіх сферах грамад-скага жыцця.

**Літаратура**


1. *Киселев А. А.* Система государственных учреждений и чиновничество Беларуси в политике российского правительства (конец XVIII – первая половина XIX в.): Дис. … канд. ист. наук: 07.00.03. – Мн.: БГУ, 2003.
2. Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917) / Сост. Т.Е. Леонтьева. – Ми.: БелНИИДАД, 2006.
3. Национальный исторический архив Беларуси. – Ф.1430. Канцелярия витебского гражданского губернатора. – Оп. 1. – Д. 25436.
4. Национальный исторический архив Беларуси. – Ф. 2001. Канцелярия могилёвско-го гражданского губернатора. – Оп.1. – Д.512.
5. Полное собрание законов Российской империи. - Собрание первое: В 45 т.- СПб.: Тип. II отд. Собств. Его Имп. Вел. Канцел.,1830. - Т. XXIII.
6. Свод законов Российской империи, повелением гос. Имп. Николая Павловича составленный. Изд.1832 г. – СПб.: Тип. II отд. Собств. Его Имп. Вел. Канцел., 1832. – Т. II.

7. Свод законов Российской империи, повелением гос. Имп. Николая Павловича составленный. Изд.1842 г. – СПб.: Тип. II отд. Собств. Его Имп. Вел. Канцел., 1842. – Т. II.

## РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ФЕАДАЛЬНАЙ РЭНТЫ НА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI – XVII стст.

**А. П. Лойка**

Другая палова XVI – XVII стст. бадай што самы драматычны і трагічны для беларускага народу. Лівонская вайна, казацкі тэрор, які падрываў моц Рэчы Паспалітай знутры, крывавая вайна з расійскай дзяржавай 1654-1667 гг. Па віне маскоўцаў-захопнікаў, што неслі па нашай зямлі смерць, гвалт, мор, беларусы згубілі больш за палову насельніцтва – 52,3 %[1, Mopzy J. Kryzys demograficzny na Litwie i Białorusi w II połowie XVII wieku. Poznań, 1965. S. 181].

Не складана ўявіць сабе наступствы ваенных ліхалеццяў сярэдзіны XVII ст. Выпаленныя населеныя пункты, дэпрэсія і, як вынік, – жудасны эканамічны крызіс, які не бачыла яшчэ зямля беларуская. Натуральна, што ўвесь цяжар па аднаўленню гаспадаркі Рэчы Паспалітай лёг на плечы звычайнага селяніна.

Сацыяльна-эканамічную аснову феадалізму складала сельскагаспадарчая вытворчасць, а менавіта сялянства з’яўлялася асноўным вытворчым класам гэтага грамадства. Таму асаблівую цікавасць уяўляе даследванне сацыяльна-эканамічных умоў жыцця «простага люду» і ў першую чаргу яго адносіны да асноўнага сродку вытворчасці феадальнага грамадства – зямлі.

Пры вывучэнні акрэсленай праблемы галоўнымі сярод гістарычных крыніц, натуральна, з’яўляюцца інвентарныя вопісы дзяржаўных, царкоўных і прыватных уладанняў

Інвентары дзяржаўных і прыватных уладанняў складаліся пры змене кіруючых адміністрацыйных асоб (старостаў, аканомаў, адміністратараў), передачу зямель у арэнду ці пасля яе аканчэння, пад час рэвізій гаспадарчага стану дзяржаўных маёнткаў, часта пры іх продажы ці заставе. У цэнтры ўвагі складальнікаў інвентарных вопісаў была, як правіла, сялянская гаспадарка. Характарыстыка феадальна-залежнага насельніцтва вызначалася ў асноўным тым, якую гаспадарчую накіраванасць меў маёнтак, якая форма рэнты ў ім пераважала. Звычайна ў інвентарах насупраць кожнай улічанай сялянскай гаспадаркі запісваўся памер яе зямельнага надзелу, яго павіннасная структура (цяглы, чыншавы ці змешаны), ступень абкладання павіннасцямі.